# ВОДГУК

на работу вучаніц 8 класа
ДУА «Сярэдняя школа № 9 імя А. С. Пушкіна»
Я. Randзіч і Я. Насатовіч «Літаратурная зорка Змітрака Куніцкага»

Даследаванне Я. Барoдзіч і Я. Насатовіч «Літаратурная зорка Змітрака Куніцкага» ўтрымлівае элемент навізны, тэма з'яўляецца цікавай і актуальнай. Пры ўмове далейшай працы над матэрыялам работа можа выкарыстоўвацца на занятках факультатыву «Полацказнаўства».

Ва ўводзінах аўтары вызначылі актуальнасць, мэту, задачы і прадмет даследавання. Акрамя ўводзінаў работа ўтрымлівае тры раздзелы, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры і дадатак. Агульны памер работы без дадатку — 21 старонка.

У рабоце надзвычай шчодра цытуюцца вершы З. Куніцкага, візуальна яны пераважаюць па аб'ёму над аўтарскім тэкстам даследчыц. Работа выглядае часам як сцэнар паэтычнай вечарыны, дзе празаічныя ўстаўкі з'яўляюцца нават не каментарыямі да вершаў, а пераказам строф, якія па нейкіх прычынах адсутнічаюць пры цытаванні асобных твораў З. Куніцкага.

Высновы па раздзелах носяць лапідарны характар, яны не вынікаюць з папярэдняга тэксту, аргументацыя часта адсутнічае. Заключэнне ў сваю чаргу не абапіраецца на вывады па раздзелах. Даследчы краязнаўчы кампанент у рабоце выяўлены вельмі слаба, практычна адсутнічае і літаратуразнаўчы аналіз вершаў. Аўтарам таксама варта звярнуць увагу на фармальныя патрабаванні да афармлення спісу выкарыстанай літаратуры.

У цэлым работа Я. Барoдзіч і Я. Насатовіч «Літаратурная зорка Змітрака Куніцкага» выканана на належным узроўні.

16.12.2014

к. гіст. н., дацэнт
кафедры гісторыі і турызму
УА «ПДУ» С.А. Шыдлоўскі